# Тематический раздел

# Тэматычны раздзел

# Special topic section

## К 85-летию филологического факультета БГУ

## Да 85-годдзя філалагічнага факультэта БДУ

## To the 85th anniversary of the faculty of philology of BSU

*УДК 82.09(476)(092) + 908(476)(092)*

# НА ПЛЕЧАХ ГИГАНТОВ: К ВОПРОСУ О ВЫДЕЛЕНИИ НАУЧНЫХ ШКОЛ НА ФИЛОЛОГИЧЕСКОМ ФАКУЛЬТЕТЕ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

***С. А. ВАЖНИК*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Названы имена филологов, которые внесли значительный вклад в развитие филологического факультета Белорусского государственного университета. В настоящее время мы не можем установить научное «родство» отдельных филологов, их принадлежность к той или иной научной школе. В частности, речь идет об определении научных руководителей кандидатских диссертаций многих преподавателей факультета, которые работали в университете в 1920–60-х гг. Показано, что появление белых пятен вызвано объективными причинами. Впервые выделены научные поколения преподавателей. Исследование проведено в рамках филологического источниковедения.

**Образец цитирования:**
Важнік СА. На плячах гігантаў: да пытання аб вылучэнні навуковых школ на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2024;3:5–19.
EDN: YZDAZS

**For citation:**
Vazhnik SA. On the shoulders of giants: on the issue of the allocation of scientific schools at the faculty of philology of the Belarusian State University. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2024;3:5–19. Belarusian.
EDN: YZDAZS

**Автор:**
***Сергей Александрович Важник*** – кандидат филологических наук, доцент; профессор кафедры белорусского языкознания, декан филологического факультета.

**Author:**
***Syarhei A. Vazhnik***, PhD (philology), docent; professor at the department of Belarusian linguistics, dean of the faculty of philology.
*vazhnik@bsu.by*
*https://orcid.org/0009-0000-1679-0746*

Выявлены существующие источники информации и сделан вывод о том, что их недостаточно для определения всех научных школ факультета. Выяснено, что слабо разработан такой жанр, как мемуаристика.

***Ключевые слова:*** научная школа; кадры высшей научной квалификации; научное «родство»; научный «род»; научные поколения; филологическое источниковедение.

# НА ПЛЯЧАХ ГІГАНТАЎ: ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫЛУЧЭННІ НАВУКОВЫХ ШКОЛ НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

***С. А. ВАЖНІК*** [1*]

[1*] *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Названы імёны філолагаў, якія зрабілі важкі ўнёсак у развіццё філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У цяперашні час мы не можам устанавіць навуковую «роднасць» асобных філолагаў, іх прыналежнасць да той ці іншай навуковай школы. У прыватнасці, гаворка ідзе аб вызначэнні навуковых кіраўнікоў кандыдацкіх дысертацый многіх выкладчыкаў факультэта, якія працавалі ва ўніверсітэце ў 1920–60-я гг. Паказана, што з'яўленне белых плям выклікана аб'ектыўнымі прычынамі. Упершыню вылучаны навуковыя пакаленні выкладчыкаў. Даследаванне праведзена ў рэчышчы філалагічнага крыніцазнаўства. Выяўлены існуючыя крыніцы інфармацыі і зроблена выснова аб тым, што іх недастаткова для вызначэння ўсіх навуковых школ факультэта. Высветлена, што слаба распрацаваны такі жанр, як мемуарыстыка.

***Ключавыя словы:*** навуковая школа; кадры вышэйшай навуковай кваліфікацыі; навуковая «роднасць»; навуковы «род»; навуковыя пакаленні; філалагічнае крыніцазнаўства.

# ON THE SHOULDERS OF GIANTS: ON THE ISSUE OF THE ALLOCATION OF SCIENTIFIC SCHOOLS AT THE FACULTY OF PHILOLOGY OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

***S. A. VAZHNIK*** [a]

[a] *Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The names of philologists who have made a significant contribution to the development of the faculty of philology of the Belarusian State University are named. Currently, we cannot determine the scientific «kinship» of individual philologists, their belonging to one or another scientific school. In particular, we are talking about the definition of scientific supervisors for the PhD theses of many faculty teachers who worked at the university in the 1920–60s. It has been shown that white spots are caused by objective reasons. For the first time, scientific generations of teachers have been distinguished. The research was conducted within the framework of philological source studies. Existing sources of information have been identified and the conclusion that they are insufficient to identify all scientific schools of the faculty is made. It was found that such a genre as memoiristics is poorly developed.

***Keywords:*** scientific school; personnel of the highest scientific qualification; scientific «kinship»; scientific «genus»; scientific generations; philological source studies.

## Уводзіны

У лістападзе 2024 г. флагман філалагічнай адукацыі нашай краіны – філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – святкуе сваё 85-годдзе.

Як казалі старажытныя, мы стаім на плячах папярэднікаў. Сённяшнія поспехі філалагічнага факультэта БДУ, бясспрэчна, звязаны з дасягненнямі нашых настаўнікаў, якія, як сапраўдныя гіганты, трымаюць нас і сучасную філалагічную навуку на сваіх плячах. Гісторыю і навуку робяць асобы!

Сучасны філалагічны факультэт – найбуйнейшы ва Усходняй Еўропе цэнтр *беларусістыкі*, *русістыкі* і *славістыкі*. Менавіта гэтыя міждысцыплінарныя вобласці, што ахопліваюць мову, літаратуру, культуру і гісторыю таго ці іншага народа, плённа вывучаюцца і даследуюцца з першых дзён функцыянавання БДУ як нацыянальнага ўніверсітэта – з 1921 г.

З 1990-х гг. на філалагічным факультэце пачынаюць распрацоўвацца такія напрамкі, як *класічная філалогія*, *германістыка* і *раманістыка*, што звязана з заснаваннем профільных кафедр. З 2001 г. плённа развіваецца і *кітаістыка*.

Гонар і славу філалагічнага факультэта стваралі цэлыя пакаленні, навуковыя школы (НШ) моваведаў, літаратуразнаўцаў, фалькларыстаў, метадыстаў, а таксама паэты і празаікі. Не злічыць імёны пісьменнікаў – выхаванцаў факультэта. Многія грамадскія і культурныя дзеячы вучыліся і (або) працавалі на філалагічным факультэце БДУ. Так, напрыклад, 8 з 18 народных паэтаў і пісьменнікаў Беларусі звязалі свой лёс з галоўнай установай вышэйшай адукацыі краіны. Гэта класікі нацыянальнай літаратуры Якуб Колас, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Іван Мележ, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Іван Навуменка, Іван Чыгрынаў.

На дадзены момант на факультэце існуюць пяць афіцыйна вызначаных НШ [1]:

1) НШ «Беларуская мова і мовазнаўства» (ля вытокаў стаялі Я. Ю. Лёсік, С. М. Некрашэвіч, П. А. Бузук, А. Я. Багдановіч, І. А. Воўк-Левановіч, Л. М. Цвяткоў);

2) НШ «Культурна-гістарычнае літаратуразнаўства» (заснавальнік – І. І. Замоцін);

3) НШ «Руская мова ў сітуацыі дзяржаўнага двухмоўя» (заснавальнік – П. П. Шуба);

4) НШ «Тэорыя мовы і славістыка» (заснавальнік – А. Я. Супрун);

5) НШ «Тэорыя і методыка выкладання мовы, літаратуры і рыторыкі» (заснавальнік – Л. А. Мурына).

Тым не менш факультэцкіх НШ істотна больш, чым прынята лічыць. Паспрабуем гэта паказаць і даказаць, прымаючы ў разлік навуковую «роднасць» выкладчыкаў факультэта. Пачнём з першых «абароненых».

Мы не думалі, што сутыкнёмся з сапраўднай праблемай, звязанай з вызначэннем навуковай «роднасці» і «сваяцтва» выкладчыкаў нашага факультэта. Так, пошук навуковага кіраўніка кандыдацкіх дысертацый асобных выкладчыкаў вельмі часта выклікаў цяжкасці. Аднак пытанне застаецца адкрытым па многіх выкладчыках, што працавалі на факультэце ў 1940–60-я гг.

Метад суцэльнай выбаркі працуе надзейна не заўсёды. Мы апыталі ўсіх, хто можа яшчэ хоць нешта памятаць, і сутыкнуліся з праблемай: мала хто ведаў пра абароны першых выкладчыкаў той ці іншай факультэцкай кафедры. Выпалі 1940–60-я гады. У сувязі з гэтым мы хацелі б падзякаваць Д. В. Дзятко, І. Л. Капылову, А. І. Бельскаму, М. Р. Прыгодзічу і Т. П. Шубе за дапамогу ў пошуках новых крыніц інфармацыі. У нашай пошукавай рабоце былі выкарыстаны таксама існуючыя бібліяграфічныя ўказальнікі і даведнікі[1].

У 1940–50-я гг. існавала практыка запрашаць у БДУ вядомых спецыялістаў па мове і літаратуры або з іншых устаноў вышэйшай адукацыі, у тым ліку з маскоўскіх і ленінградскіх, або з АН БССР. Кадры вышэйшай навуковай кваліфікацыі ў 1940–50-я гг. прыходзілі ў асноўным «абароненыя». Так, напрыклад, прыйшлі на ўніверсітэцкую кафедру з АН БССР вядомыя літаратуразнаўцы і пісьменнікі Алесь Адамовіч і Юльян Пшыркоў.

Першыя навуковыя «дынастыі», узгадаваныя і выпеставаныя непасрэдна на філалагічным факультэце БДУ, пачалі з’яўляцца ў 1950-я гг.

Устанавіць навуковую «роднасць» не заўсёды проста і па другой прычыне. Праблема ў тым, што сёння нават па аўтарэфератах бывае цяжка вызначыць навуковага кіраўніка той ці іншай дысертацыі. Так, напрыклад, у аўтарэфераце Е. С. Мяцельскай (1958) указаны кіраўнік – доктар філалагічных навук М. А. Жыдовіч, а ў аўтарэфераце Я. М. Камароўскага (1965) імя кіраўніка на вокладцы няма. У аўтарэфераце І. В. Шадурскага (1967) кіраўнік зноў ёсць. Многія дакументы той пары здадзены ўжо ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, таму застаецца толькі архіўная работа.

З улікам вышэйзгаданых прычын прыведзеныя ніжэй даныя патрабуюць праверкі і ўдакладнення. Белыя плямы непазбежны. Аднак набліжэнне да праблемы вывучэння факультэцкіх НШ дазваляе назваць імёны славутых філолагаў, што далі жыццё цэлым навуковым пакаленням сваіх вучняў. Пры гэтым

[1]Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны ўказальнік (1825–1965 гг.) / склад.: А. Д. Васілеўская [і інш.] ; рэд. Л. М. Шакун. Мінск : Навука і тэхніка, 1967. 415 с. ; Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны паказальнік (1966–1975) / склад.: А. Д. Васілеўская, Я. М. Рамановіч ; [рэд. М. В. Бірыла]. Мінск : Навука і тэхніка, 1980. 350 с. ; Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны паказальнік (1976–1985) / склад.: А. Д. Васілеўская, Я. М. Рамановіч. Мінск : Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа АН Беларусі, 1993. 556 с. ; Беларускае мовазнаўства: бібліяграфічны паказальнік (1986–1991) / склад.: А. У. Каратышэўская, А. У. Траццякова ; рэд. В. П. Русак. Мінск : Беларус. навука, 2004. 484 с. ; Беларускае мовазнаўства: дысертацыі па беларускай мове, абароненыя ў Рэспубліцы Беларусь (1990–2011 гг.) : навук. давед. / Д. В. Дзятко, С. У. Шахоўская. Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2011. 400 с. ; Лингвистика Беларуси: аннотированный указатель диссертаций (1991–2013) / сост.: П. А. Михайлов, Н. П. Теслюк. Минск : Ковчег, 2015. 268 с.

мы прытрымліваемся наступнага падыходу: нас цікавяць тыя выкладчыкі і даследчыкі, якія пасля сваіх абарон засталіся працаваць на філалагічным факультэце БДУ. Такім чынам, у публікацыі прымаліся ў разлік толькі факультэцкія вучні пры падліках прадуктыўнасці навуковых кіраўнікоў.

## Вынікі і іх абмеркаванне

**1. Беларускае мовазнаўства.** Калі казаць пра беларускае мовазнаўства, то тут выразна прасочваецца «дынастычная» лінія М. А. Жыдовіч – Л. М. Шакун (гл. падп. 1.2 і 1.3). Але пад нумарам адзін лагічна разгледзець лінію прафесара Ц. П. Ломцева, які ўвайшоў у гісторыю не толькі як першы дэкан філалагічнага факультэта БДУ (1939–1943).

***1.1. НШ Ц. П. Ломцева.*** Слова *першы* можа неаднаразова гучаць адносна гэтай легендарнай асобы. Цімафей Пятровіч – аўтар першай доктарскай дысертацыі па беларускай мове. Даследаванне «Састаўны выказнік і яго змены ў гісторыі беларускай мовы» (Мінск, 1941) напісана ў рэчышчы гістарычнага сінтаксісу беларускай мовы. Ц. П. Ломцеў вядомы і як вучоны, што стаяў ля вытокаў цэлага навуковага напрамку – рускага семантычнага сінтаксісу.

Вучаніца Цімафея Пятровіча прафесар М. У. Усеваладава працягнула дзейнасць свайго настаўніка ў галіне беларускага мовазнаўства. Узяўшы за аснову функцыянальную класіфікацыю беларускіх прыназоўнікаў, распрацаваную П. П. Шубам, Мая Уладзіміраўна апісала рускія прыназоўнікі і іх функцыянальныя аналагі, а таксама ўзначаліла міжнародны навуковы праект «Славянскія прыназоўнікі ў сінхраніі і дыяхраніі: марфалогія і сінтаксіс». Сярод беларускіх вучоных у праекце прынялі ўдзел прафесар М. І. Канюшкевіч і дацэнт С. А. Важнік.

Навуковы «род» прафесара Ц. П. Ломцева прадстаўлены на мал. 1.

Ц. П. Ломцеў → А. Я. Міхневіч* (д.) → Ю. В. Назаранка (к.)
→ Т. Л. Чахоўская (к.)

*Мал. 1.* Навуковы «род» прафесара Ц. П. Ломцева.
Знакам * пазначаны ідэйны вучань Ц. П. Ломцева

*Fig. 1.* Scientific «genus» of professor C. P. Lomcew.
Sign * denotes the disciple of C. P. Lomcew

Афіцыйным навуковым кіраўніком прафесара А. Я. Міхневіча быў Кандрат Крапіва, але сваім навуковым настаўнікам Арнольд Яфімавіч лічыў Цімафея Пятровіча, таму манаграфію «Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы» (Мінск, 1976) прысвяціў памяці Ц. П. Ломцева. А. Я. Міхневіч пазнаёміўся з Ц. П. Ломцевым падчас працы ў Камісіі па граматычным ладзе славянскіх моў пры Міжнародным камітэце славістаў. Ц. П. Ломцеў узначальваў камісію, а А. Я. Міхневіч прадстаўляў на яе пасяджэннях Беларусь.

Арнольд Яфімавіч прыйшоў у БДУ ўжо ў статусе доктара навук, прафесара. З'яўленне на кафедры сучаснай беларускай мовы ў 2000 г. А. Я. Міхневіча стала для многіх сапраўдным святам. Лепшы граматыст краіны энцыклапедызмам і пачуццём гумару ўлюбіў у сваю асобу і калег-выкладчыкаў, і студэнтаў. Вынік супрацоўніцтва з кафедрай – навуковыя «дзеці», дацэнты Ю. В. Назаранка і Т. Л. Чахоўская.

***1.2. НШ М. А. Жыдовіч.*** На мал. 2 прадстаўлены далёка няпоўны спіс «абароненых» вучняў прафесара М. А. Жыдовіч. Марыя Андрэеўна – першы доктар філалагічных навук (беларуская мова) не толькі ў БДУ, але і ў рэспубліцы [2, с. 140–149] – стала навуковай «мамай» для многіх тагачасных моваведаў. Найбольш выбітны вучань Марыі Андрэеўны – Л. М. Шакун, які мае ўласную шматлікую НШ (гл. падп. 1.3).

М. А. Жыдовіч
→ Л. М. Шакун (к.)
→ І. В. Шадурскі (к.)
→ Е. С. Мяцельская (к.)
→ М. Д. Міхей (к.)
→ У. М. Лазоўскі (к.)
→ Э. Д. Блінава (к.)
→ Н. І. Гілевіч (к.)
→ З. А. Зяневіч (к.)
→ А. І. Наркевіч (д.)
→ Л. І. Бурак (д.)

*Мал. 2.* Навуковы «род» прафесара М. А. Жыдовіч

*Fig. 2.* Scientific «genus» of professor M. A. Zhydovich

Навуковы кансультант Марыі Андрэеўны па доктарскай дысертацыі – вядомы спецыяліст па гістарычным сінтаксісе рускай і беларускай моў акадэмік АН СССР В. І. Баркоўскі. З кандыдацкай ды-

сертацыяй усё значна цяжэй. М. А. Жыдовіч абараніла кандыдацкую дысертацыю ў вучоным савеце БДУ 15 жніўня 1944 г. На жаль, звестак аб абароне ў архіве БДУ няма. Тэкст дысертацыі і аўтарэферата адсутнічае ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ, як і ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Пратакол пасяджэння савета здадзены ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (фонд 205), аднак на момант напісання артыкула архіў знаходзіўся на рамонце, таму надзея ўстанавіць імя кіраўніка пакуль застаецца…

***1.3. НШ Л. М. Шакуна.*** Галоўнае навуковае дасягненне Л. М. Шакуна – фарміраванне НШ «Беларускае дыяхранічнае мовазнаўства» [3, с. 15].

Многія з вучняў Льва Міхайлавіча працягнулі яго навуковы «род» (мал. 3).

- Л. М. Шакун
  - В. П. Красней (к.) → М. У. Юнаш (к.)
  - З. Б. Вარановіч (к.)
  - Л. І. Сямешка (к.) → Г. К. Чахоўскі (к.)
  - І. Р. Шкраба (к.) → Ю. С. Бушлякоў (к.)
  - М. Р. Прыгодзіч (к., д.)
    - І. А. Гапоненка (д.)
    - Г. І. Кулеш (д.)
    - Н. Ю. Перавалава (к.)
    - М. І. Свістунова (к.)
    - М. Л. Савасцюк (к.)
  - Г. І. Басава (к.)
  - З. І. Бадзевіч (к.)
    - І. І. Савіцкая (к.)
    - А. Л. Садоўская (к.)
  - І. Ф. Лысенка (к.)
  - Г. І. Кулеш (к.)
    - А. В. Губкіна (к.)
    - В. А. Зразікава (к.)
  - В. М. Ляшук (к.) → І. В. Галубенка (к.)
  - І. А. Гапоненка (к.)
  - Ж. Я. Беларуская (к.)

*Мал. 3.* Навуковы «род» прафесара Л. М. Шакуна
(складзена па даных [3, с. 198–199; 4, с. 163–172])

*Fig. 3.* Scientific «genus» of professor L. M. Shakun
(compiled based on [3, p. 198–199; 4, p. 163–172])

Як бачым, асобае месца займае НШ прафесара М. Р. Прыгодзіча. Пры гэтым адзначым, што Мікалай Рыгоравіч рыхтуе спецыялістаў не толькі для сваёй кафедры, але і для іншых кафедр факультэта.

Іншыя абароны па беларускім мовазнаўстве прадстаўлены на мал. 4.

- М. І. Гурскі → Я. М. Камароўскі (к.) → Ю. С. Бушлякоў (к.)
- Б. І. Касоўскі → І. А. Карабань (к.)
- А. І. Жураўскі → Г. К. Ціванова (к.)
  - В. У. Бандаровіч (к.)
  - В. У. Басько (к.)
- Л. І. Бурак
  - Т. Р. Рамза (к.)
  - У. І. Куліковіч (к.)
- Б. А. Плотнікаў → В. П. Трайкоўская (к.)
- У. М. Лазоўскі → Н. У. Чарнаброўкіна (к.)
- Г. А. Цыхун
  - С. М. Запрудскі (к.)
    - Н. В. Яненка (к.)
    - А. У. Лянкевіч (к.)
  - К. П. Любецкая (к.)
  - А. С. Суркова (д.)
- А. К. Кіклевіч → С. А. Важнік (к.)

*Мал. 4.* Іншыя абароны па беларускім мовазнаўстве

*Fig. 4.* Other defenses in Belarusian linguistics

**2. Рускае мовазнаўства.** У моваведаў-русістаў выразна вылучаюцца два цэнтры. Прычым традыцыі і аднаго, і другога актуальныя да сённяшняга дня, яны звязаны з імёнамі выдатных моваведаў – прафесараў М. Г. Булахава (гл. падп. 2.1) і П. П. Шубы (гл. падп. 2.2).

***2.1. НШ М. Г. Булахава.*** Падрыхтоўка навуковых кадраў у галіне русістыкі на факультэце пачалася з прыходам на кафедру рускай мовы ў 1965 г. вядомага вучонага М. Г. Булахава. Даследчыка цікавілі пытанні не толькі рускага, беларускага і славянскага мовазнаўства, але і агульнага мовазнаўства, што знайшло адлюстраванне ў яго асабістых працах і працах выкладчыкаў кафедры [5, с. 110–111]. Відавочна, на навуковыя інтарэсы Міхаіла Гапеевіча паўплываў навуковы кіраўнік кандыдацкай дысертацыі – ленінградскі прафесар С. Р. Бархудараў [6, с. 257].

Навуковыя традыцыі М. Г. Булахава працягнулі прафесары А. І. Яновіч, С. М. Прохарава і Н. Б. Мячкоўская (мал. 5).




*Мал. 5.* Навуковы «род» прафесара М. Г. Булахава
*Fig. 5.* Scientific «genus» of professor M. G. Bulahaw

Калі С. М. Прохарава [4, с. 285–294] і А. І. Яновіч у асноўным умацоўвалі пазіцыі русістаў, то Н. Б. Мячкоўская прычынілася да развіцця кафедры класічнай філалогіі і кафедры англійскага мовазнаўства.

***2.2. НШ П. П. Шубы.*** У працэсе пошуку навуковага кіраўніка кандыдацкай дысертацыі П. П. Шубы ўзніклі пэўныя цяжкасці. Як выпускнік Слуцкага педагагічнага вучылішча, Павел Паўлавіч працягнуў адукацыю ў педагагічным інстытуце, у тым ліку скончыў у ім аспірантуру, але абараняўся ў Інстытуце мовазнаўства АН БССР. Пошукі даных у архівах Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка і БДУ не далі патрэбных вынікаў, бо архіў першага быў затоплены і значная колькасць дакументаў знікла, а ў архіве другога не было інфармацыі пра гэты перыяд. Апошняя надзея заставалася на Фундаментальную бібліятэку НАН Беларусі, але тэксту дысертацыі ў яе каталозе не аказалася. Унучка Паўла Паўлавіча – Таццяна Шуба – падказала, што на тытульнай старонцы яго дысертацыі пазначана імя навуковага кіраўніка – прафесара М. І. Гурскага.




*Мал. 6.* Навуковы «род» прафесара П. П. Шубы
*Fig. 6.* Scientific «genus» of professor P. P. Shuba

З прыходам у 1961 г. на кафедру рускай мовы П. П. Шубы, які загадваў ёй у 1975–1999 гг., пачынаюцца даследаванні па пытаннях функцыянавання рускай мовы ў Беларусі і беларуска-рускіх моўных узаемадачыненняў [4, с. 183–195; 5, с. 112]. Гэта праблематыка знайшла адлюстраванне ў шматлікіх працах вучняў прафесара П. П. Шубы.

«Паўшубкі» (як жартоўна называюць сябе вучні Паўла Паўлавіча) праслаўляюць імя свайго настаўніка па ўсёй сінявокай. Да іх адносяцца такія вядомыя лінгвісты, як прафесары Л. М. Чумак, Т. М. Валынец, М. І. Канюшкевіч, У. І. Коваль, Л. Р. Машчэнская, Г. М. Мезенка, І. С. Роўда.

Менавіта кадры, выпеставаныя П. П. Шубам, складаюць сёння касцяк кафедры рускай мовы і блізкароднасных кафедр (мал. 6).

Як бачым, былы дэкан філалагічнага факультэта І. С. Роўда мае шэсць «абароненых» вучняў, што засталіся на факультэце, Т. М. Валынец – трох, І. Э. Ратнікава – аднаго.

**3. Тэарэтычнае і славянскае мовазнаўства.** Мэтанакіраваная падрыхтоўка славістаў пачалася на факультэце трохі пазней за падрыхтоўку беларусістаў і русістаў. У 1963 г., пасля заканчэння V Міжнароднага з’езда славістаў, М. Р. Суднік (на той час дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР) звярнуўся да рэктара БДУ А. Н. Сеўчанкі з просьбай стварыць славістычную кафедру ў складзе галоўнай установы вышэйшай адукацыі рэспублікі. Па рэкамендацыі М. І. Талстога і В. У. Мартынава кафедру мусіў узначаліць ужо вядомы вучоны-славіст Адам Яўгенавіч Супрун [2, с. 304; 5, с. 124]. З 1966 г., калі была заснавана кафедра тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, вядзецца гісторыя самай вялікай НШ філалагічнага факультэта – школы А. Я. Супруна.

Адам Яўгенавіч стварыў адну з лепшых у былым СССР кафедру агульнага мовазнаўства – кафедру тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства. Абрэвіятура КАТЕОСЯ з павагай гучала з вуснаў вучняў і дасведчаных асоб.

Некаторыя вучні А. Я. Супруна займелі сваіх «дзяцей», утварыўшы ўласныя НШ (мал. 7).




*Мал. 7.* Навуковы «род» прафесара А. Я. Супруна (складзена па даных [7])

*Fig. 7.* Scientific «genus» of professor A. Ja. Suprun (compiled based on [7])

Праведзенае даследаванне навуковай «роднасці» той ці іншай навуковай асобы дазволіла выявіць адну прынцыповую памылку: Н. Б. Мячкоўская, якая, паводле даных публікацыі [7, с. 46], лічылася вучаніцай А. Я. Супруна, пры інтэрв'юіраванні адзначыла, што кандыдацкую дысертацыю пісала ў прафесара М. Г. Булахава, а доктарскую – без кансультанта. Такім чынам, у выпадку Ніны Барысаўны паспяхова працуюць іншыя навуковыя «гены».

Вучаніца прафесара В. У. Мартынава прафесар А. М. Рудэнка таксама дапамагала факультэту рыхтаваць навуковыя кадры, робячы ўхіл у бок славянскай (украінскай) і рамана-германскай філалогіі (мал. 8).

А. М. Рудэнка
- → А. А. Барковіч (к., д.)
- → Н. А. Валатоўская (к.)
- → А. І. Копач (к.)
- → М. У. Саўко (к.)
- → Н. А. Снігір (к.)
- → К. С. Астапкіна (к.)

*Мал. 8.* Навуковы «род» прафесара А. М. Рудэнка

*Fig. 8.* Scientific «genus» of professor A. M. Rudjenka

**4. Прыкладная лінгвістыка.** Найбольш значныя дасягненні ў развіцці прыкладной лінгвістыкі на факультэце звязаны з імем прафесара У. А. Карпава. Яго НШ па сістэмалогіі налічвае чатырох вучняў (мал. 9).

У. А. Карпаў
- → А. В. Лаўрыненка (к.)
- → А. І. Галаўня (к.)
- → С. Г. Барбук (к.)
- → Д. М. Гоман (к.)

*Мал. 9.* Навуковы «род» прафесара У. А. Карпава

*Fig. 9.* Scientific «genus» of professor U. A. Karpaw

Як бачым па спісе «абароненых», Уладзімір Аляксандравіч рыхтуе пераважна спецыялістаў па прыкладной лінгвістыцы. На жаль, мусім канстатаваць, што карпаўскія традыцыі на дадзены момант на факультэце страчаны. Сёння кафедра прыкладной лінгвістыкі займаецца выключна выкладаннем рускай мовы як замежнай.

**5. Беларуская літаратура.** Чырвонай ніткай праз універсітэцкае літаратуразнаўства праходзіць «дынастычная» лінія І. І. Замоцін – М. Р. Ларчанка (гл. падп. 5.1 і 5.2).

***5.1. НШ І. І. Замоціна.*** Разам з аднадумцамі (М. М. Піятуховічам, Я. І. Барычэўскім, А. М. Вазнясенскім, А. А. Бабарэкам) прафесар Іван Іванавіч Замоцін заклаў асновы НШ «Культурна-гістарычнае літаратуразнаўства» [1; 8].

***5.2. НШ М. Р. Ларчанкі.*** Вучань І. І. Замоціна, першы доктар філалагічных навук (беларуская літаратура) М. Р. Ларчанка быў «шматдзетным» навуковым «бацькам». Па ўспамінах В. П. Рагойшы, ён стаў 40-м (!) вучнем Міхася Рыгоравіча, прычым гэта была ўсяго толькі першая абарона ў літаратурным савеце па абароне дысертацый, які быў створаны на факультэце ў 1967 г.

Развіццё школы працягнулі навуковыя «дзеці» вучняў прафесара М. Р. Ларчанкі (мал. 10).

М. Р. Ларчанка
- → І. Я. Навуменка (к.) → Т. І. Шамякіна (к.)
  - → Г. М. Мятліцкая (к.)
  - → В. У. Праскаловіч (д.)
- → Н. С. Гілевіч (к.)
- → В. В. Казлова (к.) → Л. Д. Сінькова (к.)
  - → В. У. Праскаловіч (к.)
  - → В. В. Жыбуль (к.)
  - → Л. В. Алейнік (к.)
- → М. Б. Яфімава (к.)
- → І. У. Саламевіч (к.)
- → Р. М. Семашкевіч (к.)
- → В. П. Рагойша (к.)
  - → Т. І. Шамякіна (д.)
  - → Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая (д.) → А. А. Акушэвіч (к.)

*Мал. 10.* Навуковы «род» прафесара М. Р. Ларчанкі
(складзена па даных [4, с. 95–103; 9, с. 262])

*Fig. 10.* Scientific «genus» of professor M. R. Larchanka
(compiled based on [4, p. 95–103; 9, p. 262])

Найбольш пладавітым, аднак, стаў вучань Ю. С. Пшыркова, былы дэкан філалагічнага факультэта БДУ, А. А. Лойка (гл. падп. 5.3).

***5.3. НШ А. А. Лойкі.*** Алег Антонавіч даў жыццё цэламу пакаленню маладых дактароў навук, якія складаюць сённяшнюю літаратуразнаўчую эліту нашай краіны (А. І. Бельскі, С. В. Кавалёў, Л. Д. Сінькова і інш.). Па ўспамінах прафесара А. І. Бельскага, ва ўніверсітэцкім савеце пры А. А. Лойку было абаронена 17 доктарскіх дысертацый і больш за 80 кандыдацкіх дысертацый. Алега Антонавіча моцна крытыкавалі за такое шчыраванне, аднак «чалавек з сонечнай усмешкай» ведаў: ён дазваляе расці нацыянальным навуковым кадрам і такім чынам спрыяе развіццю філалагічнай навукі і адукацыі [10, с. 140].

Вучні працягнулі навуковы «род» прафесара А. А. Лойкі (мал. 11).

А. А. Лойка
- → Л. К. Тарасюк (к.)
- → У. А. Навумовіч (к.)
- → С. В. Кавалёў (к., д.)
- → Л. Д. Сінькова (д.)
  - → В. У. Праскаловіч (к.)
  - → В. В. Жыбуль (к.)
  - → Л. В. Алейнік (к.)
- → А. І. Бельскі (к., д.) → В. В. Круглова (к.)
- → А. А. Пашкевіч (к.)
- → В. А. Максімовіч (к., д.)
- → І. М. Запрудскі (к.)
- → У. В. Рагойша (к.)
- → У. Ю. Верына (к.)

*Мал. 11.* Навуковы «род» прафесара А. А. Лойкі
(складзена па даных [4, с. 83–94])

*Fig. 11.* Scientific «genus» of professor A. A. Lojka
(compiled based on [4, p. 83–94])

Іншыя абароны па беларускай літаратуры прадстаўлены на мал. 12.

Л. Л. Кароткая → Т. П. Казакова (к.); → А. А. Шалемава (к.)
Д. Я. Бугаёў → А. М. Дарагакупец-Навіцкая (к.)
К. Р. Хромчанка → П. І. Навойчык (к.)
А. Л. Верабей → І. І. Шматкова (к.)
П. І. Навуменка → А. В. Шышко (к.)
У. Г. Кароткі → Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая (к.) → А. А. Акушэвіч (к.)

*Мал. 12.* Іншыя абароны па беларускай літаратуры

*Fig. 12.* Other defenses in Belarusian literature

На думку прафесара А. І. Бельскага, літаратуразнаўцы БДУ – прадстаўнікі НШ «Культурна-гістарычнае літаратуразнаўства». Больш за тое, усе яны стваралі і ствараюць гісторыю нацыянальнай літаратуры, даследуючы творчасць класікаў беларускай літаратуры і закладаючы такім чынам падмурак літаратурнай адукацыі ў нашай краіне [11].

**6. Руская літаратура.** На кафедры рускай літаратуры сёння выразна прасочваюцца дзве лініі – ганчароўская і скарапанаўская. Першая ўзыходзіць да легендарнай С. А. Лысенкі, у якой абараняла кандыдацкую дысертацыю С. Я. Ганчарова-Грабоўская, другая – да не менш легендарнай Л. І. Фіглоўскай (мал. 13).

І. В. Гутараў → П. І. Ткачоў (к.) → Д. Л. Башкіраў (к.)
С. А. Лысенка → С. Я. Ганчарова-Грабоўская (к.)
Л. І. Фіглоўская → Д. В. Фёдараў (к.); → Г. Д. Сіненка (к.); → І. С. Скарапанава (к.); → Г. Л. Няфагіна (к.)
Ф. І. Куляшоў → Н. В. Галаўко (к.); → С. Н. Чубакоў (к.); → А. А. Лемешаў (к.)

*Мал. 13.* Навукоўцы, якія стаялі ля выстокаў стварэння
ў кафедры рускай літаратуры

*Fig. 13.* Founders of the department of Russian literature

Лініі І. В. Гутарава [2, с. 129–139], Ф. І. Куляшова і П. І. Ткачова складаюць гісторыю кафедры і факультэта: з іх вучняў на кафедры застаўся толькі дацэнт Д. Л. Башкіраў, што абараняўся ў П. І. Ткачова.

Сучасныя НШ больш пладавітыя (мал. 14).

Г. Л. Няфагіна (к) → У. А. Капцаў (к.)

С. Я. Ганчарова-Грабоўская (к) → Н. Л. Блішч (к., д.); А. М. Лепешава (к.)

І. С. Скарапанава (к) → С. Ф. Кузьміна (к.); Т. В. Алешка (к.); Л. Л. Аўдзейчык (к.); В. Ю. Жыбуль (к.)

*Мал. 14.* Сучасныя НШ кафедры рускай літаратуры

*Fig. 14.* Modern scientific schools of the department of Russian literature

**7. Тэарэтычнае і славянскае літаратуразнаўства.** Прафесар В. П. Рагойша даўно заслужыў рэнамэ галоўнага айчыннага тэарэтыка і спецыяліста па беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемадачыненнях. Працяг даследчыцкіх інтэнцый Вячаслава Пятровіча – у доктарскіх дысертацыях Т. І. Шамякінай і Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай.

Цэнтральнай фігурай літаратуразнаўчай славістыкі ў нашай краіне без перабольшвання з'яўляецца спецыяліст па Сербіі і сербскай літаратуры І. А. Чарота. У яго ёсць чатыры факультэцкія вучні (мал. 15). Рэальныя спадзяванні на «доктарскі» працяг бачны ў асобах М. В. Труса і Г. У. Навумавай.

І. А. Чарота → І. І. Шпакоўскі (к.); М. В. Трус (к.); Э. Ю. Дзюкава (к.); Г. У. Навумава (к.)

*Мал. 15.* Навуковы «род» прафесара І. А. Чароты

*Fig. 15.* Scientific «genus» of professor I. A. Charota

**8. Фалькларыстыка.** Універсітэцкая фалькларыстыка пачынаецца з прац В. А. Захаравай у далёкія 1950-я гг. Найбольш вядомая вучаніца В. А. Захаравай – дацэнт Р. М. Кавалёва, навуковая школа якой налічвае сёння чатыры вучні (мал. 16).

Р. М. Кавалёва → Т. А. Марозава (к.); В. В. Прыемка (к.); Т. В. Лук'янава (к.); С. В. Шамякіна (к.)

*Мал. 16.* Навуковы «род» дацэнта Р. М. Кавалёвай

*Fig. 16.* Scientific «genus» of docent R. M. Kavaljova

Прафесар І. В. Казакова развівае ўласны напрамак. Разам са сваім навуковым «сынам», кандыдатам філалагічных навук Чжанам Хуншанем, Ірына Валер'еўна адкрыла ў мінулым годзе кабінет супастаўляльнага вывучэння беларускай і кітайскай традыцыйных народных культур.

**9. Замежная літаратура.** Прафесар І. В. Шаблоўская [4, с. 151–162], падсумоўваючы дзейнасць сваіх папярэднікаў (Д. Я. Фактаровіча, Б. П. Міцкевіча, Н. І. Лапідуса, В. М. Цімафеевай і інш.), стварыла на факультэце доктарскі савет па замежнай літаратуры. Першая абарона – абарона В. В. Халіпава – адбылася ў савеце ў 1998 г. Гэта была кропка адліку ў стварэнні Ірынай Вікенцьеўнай НШ «Кампаратыўнае вывучэнне літаратур», што налічвае пяць факультэцкіх вучняў (мал. 17).

І. В. Шаблоўская → В. В. Халіпаў (к.); Г. М. Бутырчык (к.); А. У. Вострыкава (к.); М. М. Хмяльніцкі (к.); Н. С. Паваляева (к.)

*Мал. 17.* Навуковы «род» прафесара І. В. Шаблоўскай

*Fig. 17.* Scientific «genus» of professor I. V. Shablowskaja

Іншыя абароны ў межах кафедральнай школы прадстаўлены на мал. 18.

Н. В. Галаўко → Т. У. Кавалёва (к.) → М. А. Шакель (к.); → А. А. Барысеева (к.)
В. В. Халіпаў → Н. У. Ламека (к.)
Е. А. Лявонава → В. Ч. Гурло (к.)
Г. В. Сініла → М. Ю. Шода (к.); → Ю. Г. Курылаў (к.)

*Мал. 18.* Іншыя абароны па замежнай літаратуры

*Fig. 18.* Other defenses in foreign literature

**10. Методыка выкладання мовы і літаратуры.** Як і А. Я. Супрун, Л. А. Мурына стварыла аўтарскую НШ [12]. Гэта яшчэ адна вялікая па колькасці «абароненых» школа, праўда ў першым «калене». Пры Ларысе Аляксандраўне ўся кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры была «абароненай».

Навуковы «род» прафесара Л. А. Мурынай прадстаўлены на мал. 19.

Толькі І. М. Саматыі неяк удалося абараніцца не ў Л. А. Мурынай (яе навуковы кіраўнік – М. Г. Яленскі). Аднак Ларыса Аляксандраўна была першым апанентам на абароне Ірыны Мікалаеўны.

Л. А. Мурына →
- Ф. М. Ліцвінка (д.)
- Г. І. Мікалаенка (д.)
- Л. М. Гameза (к., д.)
- Т. У. Ігнатовіч (к.) → Г. В. Хоміч (к.)
- Цзян Цюнь (к.)
- Т. А. Печанёва (к.)
- В. Ю. Дылеўская (к.)
- Т. В. Мальцэвіч (к.)
- В. У. Праскаловіч (к.)
- Т. У. Рубанік (к.)
- І. Э. Саўко (к.)
- І. М. Саніковіч (к.)
- І. У. Таяноўская (к.)
- В. І. Царова (к.)
- С. А. Шантаровіч (к.)
- С. М. Якуба (к.)

*Мал. 19.* Навуковы «род» прафесара Л. А. Мурынай

*Fig. 19.* Scientific «genus» of professor L. A. Muryna

**11. Класічная філалогія.** Супрацоўніцтва прафесара Н. Б. Мячкоўскай з класікамі прыносіць свае вынікі: у Ніны Барысаўны тры «класічныя» вучні (мал. 20).

Н. Б. Мячкоўская →
- В. Г. Пракапчук (к.)
- В. С. Зарэмба (к.)
- Я. У. Прыстаўка (к.)

*Мал. 20.* «Класічныя» вучні прафесара Н. Б. Мячкоўскай

*Fig. 20.* «Classic» students of professor N. B. Mjachkowskaja

Іншыя абароны па класічнай філалогіі прадстаўлены на мал. 21.

К. М. Гюлумянц → А. В. Гарнік (к.)
Г. І. Шаўчэнка → А. У. Кірычэнка (к.)
У. А. Карпаў → Д. М. Гоман (к.)
Т. М. Валынец → К. В. Стрыга (к.)

*Мал. 21.* Іншыя абароны па класічнай філалогіі

*Fig. 21.* Other defenses in classical philology

**12. Кітаістыка.** У кітаістаў няма выразнага цэнтра. Школа кітаістаў на факультэце толькі фарміруецца за кошт спецыялістаў па замежнай літаратуры, рускай мове, тэорыі мовы, фалькларыстыцы (мал. 22).

М. М. Хмяльніцкі → В. В. Жукавец (к.)
Н. М. Шахназаран → А. М. Букатая (к.)
І. Э. Ратнікава → Ван Юйхун (к.)
Л. А. Казлоўская → П. С. Бабкіна (к.)
І. В. Казакова → Чжан Хуншань (к.)

*Мал. 22.* Абароны па кітаістыцы

*Fig. 22.* Defenses in Chinese studies

## Высновы

Вялікі ўнёсак у развіццё філалагічнага факультэта БДУ зрабілі тыя навукоўцы, што былі і застаюцца першымі: М. А. Жыдовіч і М. Р. Ларчанка, М. Г. Булахаў і П. П. Шуба, Л. М. Шакун і А. А. Лойка, А. Я. Супрун і Л. А. Мурына. Гэта тыя самыя пачынальнікі, якія і сёння трымаюць на сваіх магутных плячах факультэт.

На факультэце традыцыйна дамінуюць НШ беларусістаў, русістаў і славістаў. НШ па класічнай філалогіі і кітайскай філалогіі толькі фарміруюцца. Тое ж адзначым і ў дачыненні да рамана-германскай філалогіі.

Самыя вялікія факультэцкія НШ створаны А. Я. Супруном (19 «абароненых» выкладчыкаў факультэта), Л. А. Мурынай (17) і П. П. Шубам (14). Дадатковыя вынікі гл. у табл. 1.

Табліца 1

**Факультэцкія НШ: колькасць «абароненых» выкладчыкаў**

Table 1

**Faculty scientific schools: number of «defended» lecturers**

| Кіраўнік НШ | Колькасць «абароненых» выкладчыкаў | Кіраўнік НШ | Колькасць «абароненых» выкладчыкаў |
|---|---|---|---|
| А. Я. Супрун | 19 | І. С. Скарапанава | 4 |
| Л. А. Мурына | 17 | І. А. Чарота | 4 |
| П. П. Шуба | 14 | Ф. І. Куляшоў | 3 |
| Л. М. Шакун | 12 | Г. А. Цыхун | 3 |
| М. А. Жыдовіч | 10 | Л. Д. Сінькова | 3 |
| А. А. Лойка | 10 | Т. М. Валынец | 3 |
| М. Г. Булахаў | 9 | С. А. Лысенка | 2 |
| Н. Б. Мячкоўская | 8 | Л. І. Бурак | 2 |
| М. Р. Ларчанка | 7 | С. М. Прохарава | 2 |
| Б. Ю. Норман | 7 | Т. У. Кавалёва | 2 |
| І. С. Роўда | 6 | А. Я. Міхневіч | 2 |
| А. М. Рудэнка | 6 | З. І. Бадзевіч | 2 |
| І. В. Шаблоўская | 5 | Г. К. Ціванова | 2 |
| А. І. Яновіч | 5 | В. П. Рагойша | 2 |
| А. А. Кожынава | 5 | Т. І. Шамякіна | 2 |
| М. Р. Прыгодзіч | 5 | С. Я. Ганчарова-Грабоўская | 2 |
| Л. І. Фіглоўская | 4 | Г. І. Кулеш | 2 |
| У. А. Карпаў | 4 | Г. В. Сініла | 2 |
| Р. М. Кавалёва | 4 | С. М. Запрудскі | 2 |

Амаль цалкам у плане вызначэння навуковага кіраўніцтва выпалі 1920–30-я гг., часткова – 1940–50-я гг., што ілюструе табл. 2. Асноўная колькасць пералічаных у артыкуле НШ былі створаны ў 1960–90-я гг.

На жаль, засталіся белыя плямы: не вызначана навуковая «роднасць па кандыдацкай лініі» І. В. Гутарава, М. А. Жыдовіч, Ю. С. Пшыркова, Д. Я. Фактаровіча, Л. І. Фіглоўскай, С. А. Лысенкі, Ф. І. Куляшова, Б. П. Міцкевіча, В. А. Захаравай, Л. Л. Кароткай, Л. І. Бурака, А. Х. Александровіча і многіх іншых. Такім чынам, праца мусіць быць працягнута, таму заклікаем загадчыкаў кафедр далучацца да пошукавай работы і складаць «дынастычнае дрэва» кожнай кафедры.

Найбольшая колькасць навуковых пакаленняў зафіксавана ў даследчыкаў беларускага прыгожага пісьменства: І. І. Замоцін – М. Р. Ларчанка – В. П. Рагойша – Т. І. Шамякіна або Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая – вучні Т. І. Шамякінай або Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай. Па тры пакаленні ўстаноўлена ў моваведаў-беларусістаў, моваведаў-русістаў і славістаў: М. А. Жыдовіч – Л. М. Шакун – М. Р. Прыгодзіч – вучні М. Р. Прыгодзіча; П. П. Шуба – І. С. Роўда – І. Э. Ратнікава – вучні І. Э. Ратнікавай; А. Я. Супрун – Б. Ю. Норман – А. К. Кіклевіч – С. А. Важнік; А. Я. Супрун – Б. Ю. Норман – Л. А. Казлоўская – П. С. Бабкіна. Ва ўсіх астатніх у лепшым выпадку налічваецца па два пакаленні.

Таблiца 2

**Факультэцкія НШ: часавая перспектыва**

Table 2

**Faculty scientific schools: a time perspective**

| Перыяд | БМ | РМ | ТіСлМ | ПрЛ | БЛ | РЛ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1920-я гг. | – | – | – | – | І. І. Замоцін | – |
| 1930-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 1940-я гг. | М. А. Жыдовіч | – | – | – | М. Р. Ларчанка | І. В. Гутараў |
| 1950-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 1960-я гг. | Л. М. Шакун | М. Г. Булахаў | А. Я. Супрун | – | Д. Я. Бугаёў | Л. І. Фіглоўская<br>С. А. Лысенка<br>Ф. І. Куляшоў |
| 1970-я гг. | Л. І. Бурак | П. П. Шуба | Б. Ю. Норман | У. А. Карпаў | І. Я. Навуменка<br>В. В. Казлова | П. І. Ткачоў |
| 1980-я гг. | М. Р. Прыгодзіч | А. І. Яновіч | Б. А. Плотнікаў | С. М. Прохарава | А. А. Лойка | – |
| 1990-я гг. | Г. І. Кулеш | І. С. Роўда<br>Т. М. Валынец | Н. Б. Мячкоўская | Л. М. Чумак | – | І. С. Скарапанава<br>С. Я. Ганчарова-Грабоўская<br>Г. Л. Няфагіна |
| 2000-я гг. | А. Я. Міхневіч | І. Э. Ратнікава | А. А. Кожынава<br>А. М. Рудэнка | – | А. І. Бельскі<br>Л. Д. Сінькова | – |
| 2010-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 2020-я гг. | – | – | – | – | – | – |

| Перыяд | ТіСлЛ | ЗЛ | Ф | Мет | КлФ | КітФ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1920-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 1930-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 1940-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 1950-я гг. | – | – | В. А. Захарава | – | – | – |
| 1960-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 1970-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 1980-я гг. | В. П. Рагойша<br>І. А. Чарота | – | Р. М. Кавалёва | – | – | – |
| 1990-я гг. | Т. І. Шамякіна | І. В. Шаблоўская | – | Л. А. Мурына | – | – |
| 2000-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 2010-я гг. | – | – | – | – | – | – |
| 2020-я гг. | – | – | – | – | – | Н. Б. Мячкоўская<br>М. М. Хмяльніцкі |

У цэнтры той ці іншай буйной НШ знаходзіцца асоба даследчыка-навукоўца, які робіць адкрыцці, прапаноўвае наватарскія ідэі, што развіваюцца калегамі і вучнямі-аднадумцамі і прадвызначаюць развіццё філалагічнай навукі [11, с. 57].

Філалагічнаму факультэту БДУ ўсяго толькі 85 год. А значыць, гісторыя роднай альма-матар працягваецца. І нам нельга паўтарыць памылку папярэднікаў: сёння амаль няма крыніц мемуарнага характару і ўспамінаў. Заклікаем пачаць ствараць такія ўспаміны, пакуль мы помнім тых, хто нас вучыў і выхоўваў. У сувязі з гэтым ухвалім дзейнасць прафесара А. І. Бельскага, які са студэнцкіх гадоў пачаў збіраць успаміны пра выбітных выкладчыкаў факультэта (гл. публікацыі [10; 13; 14]).

Такім чынам, не гісторыі нам бракуе, а напісанага пра яе… Далучайцеся да стварэння поўнай гісторыі філалагічнага факультэта БДУ! Без белых плям.

## Скарачэнні

**БЛ** – беларуская літаратура; **БМ** – беларускае мовазнаўства; **д.** – доктарская дысертацыя; **ЗЛ** – замежная літаратура; **к.** – кандыдацкая дысертацыя; **КітФ** – кітайская філалогія; **КлФ** – класічная філалогія; **Мет** – методыка выкладання мовы і літаратуры; **ПрЛ** – прыкладная лінгвістыка; **РЛ** – руская літаратура; **РМ** – рускае мовазаўства; **ТіСлЛ** – тэарэтычнае і славянскае літаратуразнаўства; **ТіСлМ** – тэарэтычнае і славянскае мовазнаўства; **Ф** – фалькларыстыка.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Бельский АИ, Ровдо ИС, Козловская ЛА, Проскалович ОВ, Пригодич НГ. Научные школы филологического факультета. В: Абламейко СВ, Зеленков АИ, редакторы. *Научные школы БГУ в воспоминаниях и размышлениях профессоров.* Минск: БГУ; 2023. с. 229–250.

2. Король АД, редактор. *Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–2001)*. Минск: БГУ; 2021. 319 с.

3. Прыгодзіч МР, рэдактар. *Памяць і слава: Леў Міхайлавіч Шакун. Да 90-годдзя з дня нараджэння*. Мінск: БДУ; 2016. 214 с.

4. Король АД, редактор. *Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–2021)*. Минск: БГУ; 2021. 319 с.

5. Роўда ІС, рэдактар. *Філалагічны факультэт. Да 70-годдзя заснавання.* Мінск: БДУ; 2008. 191 с.

6. Дзятко ДВ, Міхайлаў ПА. *Мовазнаўцы: нарысы па гісторыі беларускай лінгвістыкі*. Мінск: А. М. Янушкевіч; 2017. 496 с.

7. Кожинова АА. О научной школе проф. А. Е. Супруна. В: Шевченко ГИ, редактор. *Память и слава. К 75-летию со дня рождения А. Е. Супруна*. Минск: БГУ; 2003. с. 43–46.

8. Шумейко МФ. Иван Иванович Замотин. Первопроходец белорусской текстологии. В: Абламейко СВ, редактор. *Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941).* Минск: БГУ; 2017. с. 151–161.

9. Шумейко МФ. Михаил Григорьевич Ларченко. Один из крупнейших белорусских литературоведов. В: Король АД, редактор. *Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1961)*. Минск: БГУ; 2019. с. 260–271.

10. Бельскі АІ, укладальнік. *Чалавек з сонечнаю ўсмешкай: кніга пра Алега Лойку*. Мінск: Зміцер Колас; 2019. 324 с.

11. Бельскі АІ. Тры асобы: матэрыялы для нацыянальнага «Педагагічнага энцыклапедычнага слоўніка». У: Бельскі АІ, рэдактар. *Філалагічная адукацыя. Выпуск 2*. Мінск: БДУ; 2011. с. 57–62.

12. Праскаловіч ВУ, Валочка ГМ, Зелянко ВУ. Служыць навуцы. Да юбілею Л. Мурынай. *Роднае слова*. 2016;3:60–61.

13. Бельскі АІ, рэдактар. *Навукоўцы кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя БДУ*. Мінск: БДУ; 1999. 99 с.

14. Бельскі АІ, укладальнік. *Імёнаў светлае аблічча*. Мінск: БДУ; 2002. 210 с.

## References

1. Bel'skii AI, Rovdo IS, Kozlovskaya LA, Proskalovich OV, Prigodich NG. [Scientific schools of the faculty of philology]. In: Ablameiko SV, Zelenkov AI, editors. *Nauchnye shkoly BGU v vospominaniyakh i razmyshleniyakh professorov* [Scientific schools of BSU in the memories and reflections of professors]. Minsk: Belarusian State University; 2023. p. 229–250. Russian.

2. Karol AD, editor. *Intellektual'naya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoi nauki i vysshego obrazovaniya (1919–2001)* [The intellectual elite of Belarus. Founders of Belarusian science and higher education (1919–2001)]. Minsk: Belarusian State University; 2021. 319 p. Russian.

3. Pryhodzich MR, editor. *Pamjac' i slava: Lew Mihajlavich Shakun. Da 90-goddzja z dnja naradzhjennja* [Memory and glory: Lev Mikhailovich Shakun. To the 90th anniversary]. Minsk: Belarusian State University; 2016. 214 p. Belarusian.

4. Karol AD, editor. *Intellektual'naya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoi nauki i vysshego obrazovaniya (1919–2021)* [The intellectual elite of Belarus. Founders of Belarusian science and higher education (1919–2021)]. Minsk: Belarusian State University; 2021. 319 p. Russian.

5. Rovdo IS, editor. *Filalagichny fakul'tjet. Da 70-goddzja zasnavannja* [Faculty of philology. To the 70th anniversary of the foundation]. Minsk: Belarusian State University; 2008. 191 p. Belarusian.

6. Dzjatko DV, Mihajlaw PA. *Movaznawcy: narysy pa gistoryi belaruskaj lingvistyki* [Linguists: essays on the history of Belarusian linguistics]. Minsk: A. M. Janushkevich; 2017. 496 p. Belarusian.

7. Kozhinova AA. [About the scientific school of professor A. E. Suprun]. In: Shevchenko GI, editor. *Pamyat' i slava. K 75-letiyu so dnya rozhdeniya A. E. Supruna* [Memory and glory. To the 75th anniversary of A. E. Suprun]. Minsk: Belarusian State University; 2003. p. 43–46. Russian.

8. Shumeiko MF. [Ivan Ivanovich Zamotin. Pioneer of Belarusian textual criticism]. In: Ablameiko SV, editor. *Intellektual'naya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoi nauki i vysshego obrazo-vaniya (1919–1941)* [The intellectual elite of Belarus. Founders of Belarusian science and higher education (1919–1941)]. Minsk: Belarusian State University; 2017. p. 151–161. Russian.

9. Shumeiko MF. [Mikhail Grigorievich Larchenko. One of the largest Belarusian literary scholars]. In: Karol AD, editor. *Intellektual'naya elita Belarusi. Osnovopolozhniki belorusskoi nauki i vysshego obrazovaniya (1919–1961)* [The intellectual elite of Belarus. Founders of Belarusian science and higher education (1919–1961)]. Minsk: Belarusian State University; 2019. p. 260–271. Russian.

10. Bel'ski AI, compiler. *Chalavek z sonechnaju wsmeshkaj: kniga pra Alega Lojku* [A man with a sunny smile: a book about Oleg Loika]. Minsk: Zmicer Kolas; 2019. 324 p. Belarusian.

11. Bel'ski AI. [Three persons: materials for the national «Pedagogical encyclopedic dictionary»]. In: Bel'ski AI, editor. *Filalagichnaja adukacyja. Vypusk 2* [Philological education. Issue 2]. Minsk: Belarusian State University; 2011. p. 57–62. Belarusian.

12. Praskalovich OV, Valochka GM, Zeljanko VU. [To serve science. To the anniversary of L. Murina]. *Rodnae slova*. 2016;3:60–61. Belarusian.

13. Bel'ski AI, editor. *Navukowcy kafedry belaruskaj litaratury XX stagoddzja BDU* [Scientists of the department of Belarusian literature of the 20th century of the BSU]. Minsk: Belarusian State University; 1999. 99 p. Belarusian.

14. Bel'ski AI, compiler. *Imjonaw svetlae ablichcha* [Names light face]. Minsk: Belarusian State University; 2002. 210 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 08.07.2024.*
*Received by editorial board 08.07.2024.*